

**Якім будзе біяметрычны пашпарт?**

СТАР. 4

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№230 (28594)
29 ЛІСТАПАДА 2017 г. СЕРАДА
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 9–16

**Увага: прамая лінія!**

**Газета «Звязда» праводзіць прамую лінію па тэме «Як спажыўцу адстаяць свае правы?» Ці можна вярнуць у краму абутак, набыты падчас распродажу? Што рабіць, калі замарожаная рыба аказалася сапсаванай? Ці можна не плаціць за стрыжку, калі яна вам не падабаецца? Куды звяртацца, калі вам прадалі бракаваны тавар?**

Гэтыя і іншыя пытанні можна будзе задаць у чацвер, **30 лістапада, з 11.00 да 12.00** па тэлефоне **287-18-71.** Адказваць на іх будзе **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Уладзіміраўна СУША.**

Папярэдне пытанні можна задаць па тэлефоне 287-17-50 ці даслаць на электронны адрас lubneuskaya@zviazda.by з пазнакай «прамая лінія».

## ЛІЧБА ДНЯ

## 54 тысячы

*замежных грамадзян з 67 краін свету наведалі ў 2017 годзе Беларусь па бязвізавым рэжыме да пяці сутак праз Нацыянальны аэрапорт. Большая частка з іх — грамадзяне Германіі, больш за 8 тысяч. Каля 5,5 тысячы турыстаў — з Польшчы, з Італіі прыехалі 4,5 тысячы чалавек, з ЗША — 4 тысячы, з Вялікабрытаніі — 3,8 тысячы. Перш за ўсё яны знаёмяцца з Мінскам. Беларуская сталіца, дарэчы, упершыню ўвайшла ў дваццатку самых спартыўных гарадоў свету па рэйтынгу інфармацыйнага агенцтва Sportcal. Брытанскае выданне The Times уключыла Мінск у спіс 30 гарадоў, найбольш прывабных для ўікэнда. Самы папулярны і масавы ў Беларусі — культурна-пазнавальны турызм, гэтаму спрыяюць аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, якія ў нас захаваліся.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0000 | ▲ |
| Еўра | 2,3797 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0342 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# Дзікеўскі дойлід



Іосіф ВЕРШЫЛОЎСКІ — жыхар аддзялення кругласутачнага знаходжання для пажылых людзей, якое знаходзіцца ў вёсцы Дзікева Шаркаўшчынскага раёна, зрабіў макет былой вясковай базавай школы (пасля закрыцця школы ў будынку з'явілася гэтая сацыяльная ўстанова). Іосіф Антонавіч — былы будаўнік, таму з лёгкасцю ўзяўся за выраб памяншанай копіі тыпавога будынка савецкай эпохі. Пры гэтым ён ніколі не займаўся архітэктурай і не канструяваў падобныя макеты. На працягу некалькіх месяцаў пенсіянер вылічваў прапорцыі сцен, вокнаў і дзвярэй, плошчу прылеглай тэрыторыі і ўнутранага дворыка, каб архітэктурная кампазіцыя адпавядала аналагу. Потым выразаў, выпілоўваў, клеіў, маляваў.

Многія жыхары аддзялення, а іх тут трыццаць пяць чалавек, любяць збірацца каля архітэктурнага твора самадзейнага дойліда.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Падзея

# Стратэгію абмяркуюць на з'ездзе вучоных

II з'езд вучоных Рэспублікі Беларусь пройдзе 12—13 снежня. Удзел у ім возьмуць 2100 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны

**Як паведамляе прэс-служба НАН Беларусі, чакаецца прыезд у Беларусь вялікай колькасці вядомых навукоўцаў з Саюзнай дзяржавы, краін СНД, з замежных Акадэмій навук, сусветных навукова-даследчых арганізацый і цэнтраў.**

У першы дзень работы з'езда будуць працаваць дзевяць секцый, прысвечаных асноўным кірункам развіцця навукі і міжнароднаму супрацоўніцтву. Прадугледжана таксама арганізацыя работы маладзёжнай секцыі. Пленарнае пасяджэнне адбудзецца 13 снежня. Ключавым дакументам, які будзе вынесены на II з'езд вучоных Беларусі, стане праект Стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018—2040». У дадзены момант ён праходзіць грамадскае абмеркаванне. У Стратэгіі вызначаны прыярытэты доўгатэрміновага развіцця навукі і тэхналогій, а таксама комплекс інструментаў удасканалення навукова-тэхнічнай сферы, якія забяспечаць эканамічны рост Беларусі і выхад у перспектыве на сусветны ўзровень канкурэнтаздольнасці па шэрагу кірункаў.

Мяркуецца, што дзякуючы рэалізацыі Стратэгіі да 2040 года навукаёмістасць ВУП павінна скласці 3%, доля прарыўных навуковых даследаванняў і распрацовак — 30% у агульным аб'ёме, доля высокатэхналагічных сектараў у структуры эканомікі — 10%. У агульным аб'ёме вытворчасці прамысловых прадпрыемстваў інавацыйная прадукцыя будзе займаць 25 працэнтаў.

2017 год аб'яўлены ў Беларусі Годам навукі, і правядзенне з'езда стане яго выніковым мерапрыемствам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Акцэнт на здароўе

# ТОНКАЯ РАБОТА

Штогод у цэнтры дзіцячай нейрахірургіі выконваецца каля 600 аперацый

**У Мінску пачаўся I Еўразійскі з'езд дзіцячых нейрахірургаў. Да ўдзелу запрошаны вядучыя спецыялісты з больш як 15 краін блізкага і далёкага замежжа. Арганізатарамі выступаюць Міністэрства аховы здароўя Беларусі, Еўразійская асацыяцыя дзіцячых нейрахірургаў, усерасійскае і ўкраінскае таварыствы па дзіцячай нейрахірургіі, Міжнароднае таварыства па дзіцячай нейрахірургіі (ISPN), Еўрапейскае таварыства па дзіцячай нейрахірургіі (ESPN).**

— У апошнія гады нейрахірургія наогул і дзіцячая ў прыватнасці развіваюцца неймаверна дынамічна, — адзначае **галоўны хірург Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Сяргей ЗАРЭЦКІ.** — Тое, што ў мінулым стагоддзі выконвалася на працягу некалькіх гадзін, сёння дазваляе пазбегнуць вялікай траўматызацыі, бо прымяняюцца малаінвазійныя, эндаваскулярныя ўмяшанні. Нейрахірургія — гэта сімбіёз некалькі кірункаў, не толькі неўралогіі і хірургіі, але і той жа псіхатэрапіі, а калі гэта галіна медыцыны яшчэ і з дзецьмі звязана, трэба мець на ўвазе вельмі тонкую работу.

Да 1990-х гадоў дзецям у нашай краіне аперацыі выконваліся там жа, дзе і дарослым. Затым было адкрыта спецыялізаванае нейрахірургічнае дзіцячае аддзяленне, якое працавала для маленькіх пацыентаў з усёй краіны. Стварэнне і рэканструкцыя Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі дазволіла, нарэшце, айчыннай дзіцячай нейрахірургіі выйсці на новы ўзровень — адкрылася аддзяленне еўрапейскага ўзроўню з адпаведным аснашчэннем і спецыялістамі, якія стажыраваліся за межамі краіны.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!
Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!